Подзвіг камбата

У плеядзе праслаўленых воінаў-Герояў Савецкага Саюза 236 чалавек з'яўляюцца ўраджэнцамі Смаленшчыны. У іх ліку і вядомыя савецкія палкаводцы, і радавыя салдаты, якія гераічнымі подзвігамі ў імя сацыялістычнай Айчыны зрабілі свае імёны бессмяротнымі. Тут і генерал арміі П. А. Курачкін, і генерал - палкоўнікі І. Ц. Грышын і С. П. Іваноў, і пагранічнік малодшы лейтэнант Васіль Міхалькоў, які здзейсніў свой гераічны подзвіг у першы дзень вайны, і палкавы разведчык сяржант Міхаіл Ягораў, які ўзняў сцяг Перамогі над рэйхстагам.

Тры воіны-смаляне ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры вызваленні Шуміліншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта Сцяпан Харытонавіч Зайцаў, Віктар Аляксандравіч Сцепін і Мікалай Барысавіч Барысаў. Аб апошнім і пойдзе наша размова.

Нарадзіўся М. Б. Барысаў у 1918 годзе ў вёсцы Чорная Гразь Дзямідаўскага раёна Смаленскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыўшы сямігодку, Мікалай пакідае родную вёску. Лёс прыводзіць яго на чыгуначную станцыю Фаянсавая. Там юнак працуе на вугальных складах і адначасова працягвае вучобу ў мясцовай вячэрняй школе.

У 1938 годзе Мікалая Барысава прызываюць у Чырвоную Армію, а праз паўгода, як выдатніка баявой і палітычнай падрыхтоўкі, накіроўваюць у школу малодшых камандзіраў. Але вучобу перапыніла фінская вайна 1939—40 гадоў. Мікалай едзе на фронт. Там ён зарэкамендаваў сябе валявым камандзірам. Яшчэ праз некаторы час Барысава накіроўваюць на вучобу ў Сталінградскае палітычнае вучылішча. Тут і сустрэў ён вестку аб пачатку вайны з гітлераўскай Германіяй. На фронт Мікалай Барысавіч трапіў толькі ў снежні 1941 года, пасля датэрміновага выпуску курсантаў вучылішча. З гэтага часу і пачынаецца яго франтавая біяграфія.

У гады суровых выпрабаванняў Мікалай Барысавіч Барысаў праявіў сябе як умелы камандзір, як камуніст, да канца адданы справе Леніна. Вось некалькі эпізодаў з гэтай яркай біяграфіі, якія расказваюць аб мужнасці і гераізме, праяўленых камбатам М. Б. Барысавым у баях за вызваленне Шуміліншчыны ад гітлераўскіх захопнікаў.

...Маёр Мікалай Барысаў са сваім батальёнам змагаўся ўжо на тэрыторыі Савецкай Літвы, калі да яго дайшла вестка аб прысваенні яму высокага звання Героя Савецкага Саюза. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР быў апублікаваны ў ліпені 1944 года. З хваляваннем чытаў ён радкі Указа. Чытаў і гаварыў сваім таварышам: маўляў, ваяваў, як і сотні іншых, асаблівага нічога не зрабіў. Але такі быў ужо ў яго характар: у любой справе не перабольшваць сваю ролю і свае заслугі. Ён добра разумеў, што адзін, без таварышаў па зброі, нічога значнага зрабіць не змог бы. Званне ж Героя Савецкага Саюза Мікалай Барысаў атрымаў за выключную мужнасць і адвагу, за рашучасць і знаходлівасць у баі. А было гэта так...

Нашы часці некалькі разоў запар спрабавалі з ходу авалодаць горадам Віцебскам, але кожны раз безвынікова — вораг заняў зручную пазіцыю і ўпарта абараняўся. Трэба было шукаць іншыя шляхі да перамогі. Пачалася настойлівая вучоба падраздзяленняў і іх камандзіраў. Камуніст Барысаў увесь гэты час быў сярод сваіх байцоў, дапамагаў ім авалодваць навукай перамагаць. А вопыту ў яго хапала. На рахунку ўмелага камандзіра і настаўніка байцоў была не адна бліскуча праведзеная аперацыя, аб чым яскрава сведчылі ордэны і медалі самай высокай вартасці на яго гімнасцёрцы.

Нарэшце падрыхтоўка да наступлення закончана. 23 чэрвеня 1944 года. Ноч. Стралковы батальён маёра Барысава разам з іншымі падраздзяленнямі нашай арміі асцярожна выйшаў на зыходную пазіцыю. Павольна бягуць апошнія хвіліны. Вось уверх узвілася чырвоная ракета. Гэта сігнал да наступлення. Байцы ўзялі кірунак на вёску Замошша. Батальён хутка пераадолеў тры лініі ўмацаванняў праціўніка і завязаў бой у глыбіні абароны фашыстаў. Усе свае рэзервы кінула варожае камандаванне супраць савецкіх войск. Гітлераўцы контратакавалі буйнымі сіламі танкаў і пяхоты. Вораг разумеў, што з выхадам нашых войск да ракі Заходняя Дзвіна буйныя злучэнні немцаў будуць адрэзаны ад асноўных сіл, узнікне пагроза акружэння і лёс віцебскай групоўкі будзе вырашаны.

Батальён маёра Барысава ўпэўнена адбіваў атакі праціўніка і паспяхова рухаўся наперад. Нарэшце нашы воіны падыйшлі да чыгуначнай станцыі Шуміліна, дзе знаходзіўся добра ўмацаваны фашысцкі гарнізон. Байцы маёра Барысава з ходу ўварваліся на вуліцы нашага райцэнтра. Удар быў настолькі нечаканы для ворага, што ён не змог аказаць сур'ёзнага супраціўлення. Вораг быў разбіты і пачаў адступаць. Батальён маёра Барысава праследаваў праціўніка. У ходзе боя на світанні Мікалай Барысавіч атрымаў загад фарсіраваць раку Заходняя Дзвіна і заняць Бешанковічы, размешчаныя на шашы Віцебск—Мінск. Камбат Барысаў указаў кожнаму падраздзяленню дакладныя арыенціры. З мэтай дэзінфармацыі праціўніка вырашана было наладзіць фальшывую пераправу.

Як толькі грымнулі залпы нашых батарэй, байцы штурмавых атрадаў кінуліся да лодак і плытоў і пачалі перапраўляцца на супрацьлеглы бераг. Лодка камбата плыла першай. Немцы заўважылі рух на рацэ і адкрылі моцны агонь. Вогненную сцяну разрываў, здавалася, нельга было пераадолець. Чатыры лодкі, што плылі побач з камбатам, былі патоплены. Лодка камбата дасягнула ўжо сярэдзіны ракі. Кулямётныя чэргі немцаў рэзалі ваду побач з ёй, але байцы энергічна граблі і граблі да берага. Разрывы мін і снарадаў кідалі невялікае судна з боку ў бок, асколкі прабівалі барты. Нарэшце вёслы дакрануліся да зямлі. Доўгачаканы бераг! Барысаў саскочыў на зямлю, скамандаваў «За мной, уперад!» і павёў за сабой байцоў. Тут жа трапілі пад ярасны кулямётны агонь праціўніка. Камбат залёг за павалеными дрэвамі. Побач з ім апынуўся кулямётчык Чугунаў. Непадалёку размясціліся і астатнія салдаты. Тым часам наша артылерыя перанесла лавіну агня ў глыбіню варожай абароны. А на беразе сканцэнтроўваліся ўсё новыя і новыя нашы падраздзяленні.

Бой часова заціх, але потым зноў разгараўся з новай сілай. Цяпер ужо нашы байцы вялі трапны агонь па ворагу. Захлынуліся адна за другой дзве атакі гітлераўцаў, якія спрабавалі скінуць смельчакоў у ваду. Было зразумела, што рухацца прама наперад, як кажуць, у лоб, было самагубствам, ды і заданне камандавання апынулася б пад пагрозай зрыву. Камбат вырашае ісці ў абход і ўдарыць па ворагу з тылу.

На беразе застаўся толькі ўзвод прыкрыцця, астатнія, рушылі праз балота. Ішлі доўга, стаміліся, хацелася піць, але калі наперадзе заўважылі паляну, а за ёй цвёрдую дарогу, кожны з байцоў адчуў новы прыток сіл. Кароткая падрыхтоўка да рашучага кідка — і батальён урываецца ў вёску. Гітлераўцы не чакалі смелага рэйду нашых стралкоў і пачалі кідаць зброю, частка іх кінулася наўцёкі. Але іх даганялі трапныя стрэлы савецкіх байцоў. Варожыя траншэі заняты поўнасцю. Баявое заданне па заняццю плацдарма батальён маёра Барысава выканаў паспяхова. Гэта дало магчымасць савецкім войскам развіць наступленне і завяршыць акружэнне віцебскай групоўкі праціўніка з жывой сілай і тэхнікай.

Вось за гэты подзвіг маёру Барысаву Мікалаю Барысавічу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 ліпеня 1944 года і было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Адгрымелі апошнія залпы вайны. Наша краіна прыступіла да аднаўлення разбуранай гаспадаркі. Пачалося мірнае жыццё савецкага народа. А камуніст Мікалай Барысаў працягваў службу ва Узброеных Сілах Саюза СССР. У запас ён звольніўся толькі ў 1949 годзе. Праз тры гады закончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б і працяглы час знаходзіўся на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце. Пасля заканчэння Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага працаваў настаўнікам, апошнія гады на радзіме, у Архіпаўскай васьмігадовай школе. Вучыў дзяцей савецкаму патрыятызму, адданасці Радзіме-маці, мужнасці і любві да сацыялістычнай Айчыны. Да апошніх дзён вёў вялікую работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі. 10 ліпеня 1978 года перастала біцца мужнае сэрца камандзіра і камуніста, адважнага сына нашай вялікай Радзімы.

А. КРАЧКОЎСКІ.